# ДА ПЫТАННЯ АБ ПРАФЕСІЙНА-МАРАЛЬНЫМ ВЫХАВАННІ СРОДКАМІ ЗАМЕЖНАЙ МОВЫ

**Н.А. Круглік**
БДМУ (Мінск)

*Опубликовано: Н. А. Круглик // Межкультурная коммуникация и профессионально ориентированное обучение иностранным языкам: материалы IX Международной конференции, посвященной 93-летию образования БГУ, 29 октября 2015 г. / редкол.: В. Г. Шадурский [и др.]. – Минск: РИВШ, 2015. – С. 191-193.*

Роля замежнай мовы як вучэбнай дысцыпліны асабліва ўзмацнілася і павысілася ў цяперашні час у сувязі з неабходнасцю падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў, якія валодаюць не толькі сваёй прафесіяй, але і якія могуць працаваць з літаратурай на замежнай мове, праводзіць навуковае даследванне, самастойна здабываць веды, творча выкарыстоўваць іх у сваёй практычнай дзейнасці.

Пазааўдыторная дзейнасць можа значна актывізаваць працэс выкладання і вывучэння. Дакладна арганізаваная пазааўдыторная работа садзейнічае развіццю ў студэнтаў імкнення да самаразвіцця. На жаль, ва пазааўдыторнай рабоце ёсць шмат недахопаў: адсутнічае дакладная сістэма гэтай работы; не ўсе выкладчыкі валодаюць навукова-абгрунтаванымі, мэтазгоднымі і дзейнымі формамі і метадамі выхаваўчай работы, якія сдзейнічаюць фарміраванню маральных рысаў будучага спецыяліста. Асабовыя штучныя мерапрыемствы па маральнаму выхаванню не даюць жаданых вынікаў.

Вядома, што на фарміраванне асобы і яе псіхічнае развіццё значна ўплываюць веды, якія заснаваны на пазнавальным інтарэсе. Са з’яўленнем пазнавальнага інтарэсу адбываецца перастройка працэсаў успрыяцця, мышлення і гэта садзейнічае той дзейнасці, якая вызвае цікаўнасць у студэнта.

Развіццё інтарэсаў залежыць ад характару дзейнасці слухача, актыўнасці самой асобы і ад педагагічна правільнай арганізацыі гэтага працэсу, ад асобы выкладчыка і г.д.

Улік усіх гэтых супярэчнасцей прымусоўвае заўсёды шукаць аптымальные меры ўдзелу выкладчыкаў у прафесійна-маральным выхаванні студэнтаў сродкамі замежнай мовы. Спецыфіка арганізацыі такога выхавання патрабуе выкарыстоўванне новых арганізацыйных форм вучэбна-выхавательнага працеса, такія як бяседа, дыскусія, канферэнцыя, ралевыя гульні, аргументаваныя адказы на пастауленныя праблемныя пытанні.

Асаблівую ролю ў прафесійна-маральным выхавванні студэнтаў з’яўляецца арганізаванае ўздеянне сродкамі замежнай мовы. Дзеля гэтай мэты выкарыстоўваецца размова слухачоў на замежнай мове, пасродкам якой яны могуць выяўляць свае адносіны да фактаў, падзей, з’яў грамадскага жыцця.

Большы эфект дасягаецца пасродкам абмеркавання тэксту па спецыяльнасці, калі выкладчык прапаноўвае студэнтам выказваць і развіваць ідэі, якія ёсць у тэксце, прыводзіць дапаўняльныя факты, выкарыстоўваць пры гэтым матэрыл спецыяльных дысцыплін, часопісаў, газет.

Чытанне арыгінальных тэкстаў па спецыяльнасці на замежных мовах вельмі моцна ўплывае на фарміраванне прафемсійных якасцей, на маральнае выхаванне студэнтаў, так як патрабуе ад іх самых разнастайных думак. Чытанне замежных тэкстаў дапамагае адкрыццю доступа да новых крыніц інфармацыі і дазваляе пашырыць свае веды і здавальніць інтэлектуальныя, прафесійныя і эстэтычныя патрабаванні, самастойна ўдасканальваць  валоданне мовай, вывучаць культуру іншага народа.

Зыходзячы са зместу адукацыі, можна вызначыць вядучыя прынцыпы работы па прафесіна-маральнаму выхаванню слухачоў у працэсе выкладання замежнай мовы: правільны і дакладны адбор пазнавальнага матэрыялу, тэматычнае планаванне, якое развівае лагічнае мышленне, узаемасувязь сродкаў і метадаў выхавання, мадэліраване прафесійных сітуацый, стварэнне на занятках творчай атмасферы, уключэнне слухачоў у разнабаковую і цікавую дзейнасць.